Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________Ю. П. Бондар
«____» _____________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____/р.

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці другой ступені*
*вышэйшай адукацыі 1-08 80 07 Тэорыя, методыка*
*і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці
Кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці

Семестр – 1
Лекцыі – 46
Семінарскія заняткі – 30
Аўдыторных гадзін па вучэбнай дысцыпліне – 76
Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне – 188

Экзамен – 1 семестр
Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая

Складальнікі: *І. А. Малахава,* загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі, доктар педагагічных навук, дацэнт; *Л. І. Казлоўская*, загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт; *Н. У. Самерсава,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт; *М. М. Каралёў*, дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт; *Л. Е. Раманенка,* прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт; *А. А. Макарава*, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Мінск
БДУКМ
2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі другой ступені (магістратура) па спецыяльнасці 1-08 80 07 Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці, зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24.08.2012 г. № 108

Рэцэнзенты:
*В. М. Наумчык,* прафесар кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, доктар педагагічных навук, прафесар;
*Ю. У. Міцкевіч*, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 23.04.2014 г.)

Загадчык кафедры
__________ Л. І. Казлоўская

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

Старшыня
__________ Ю. П. Бондар

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. І. Казлоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» з’яўляецца базавай у прафесійнай падрыхтоўцы магістраў як даследчыкаў праблем сацыяльна-культурнай дзейнасці розных кірункаў. Вучэбная дысцыпліна ўключана ў вучэбны план па спецыяльнасці як адна з цыкла дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі ў межах дзяржаўнага кампанента.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – павышэнне ўзроўню навукова-тэарэтычнай падрыхтоўкі магістраў у такой галіне педагагічнай навукі, як сацыяльна-культурная дзейнасць. Засваенне зместу праграмы накіравана на фарміраванне ў іх трывалай навукова-практычнай базы актыўнай прафесійнай дзейнасці і на ўключэнне ў самастойны даследчы працэс.

*Задачы* дысцыпліны:

– авалоданне ведамі асноў тэорыі, метадалогіі, тэхналогій і менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– фарміраванне ўменняў самастойнай практычнай і навукова-даследчай работы ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– фарміраванне навыкаў творчага вырашэння прафесійных пытанняў і праблем у сацыякультурнай сферы.

Дысцыпліна «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» знаходзіцца ў цеснай сувязі з такімі навукамі, як «Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы», «Метадалогія і метады педагагічных даследаванняў», «Актуальныя праблемы сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен *ведаць:*

– асаблівасці навуковых падыходаў да пабудовы тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– прынцыпы, узроўні і функцыі метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– асноўныя кірункі і тэндэнцыі развіцця гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– падыходы да класіфікацыі і сутнасць тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– тэарэтычныя і практычныя аспекты менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выяўляць, фармуляваць і ранжыраваць прафесійныя сацыякультурныя праблемы, вызначаць сярод іх вядучыя, якія патрабуюць першачарговага вырашэння;

– вызначаць крытэрыі і паказальнікі выніковасці і эфектыўнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– карыстацца ведамі тэорыі, метадалогіі, тэхналогій і менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ў прафесійнай прасторы спецыяліста сацыякультурнай сферы.

У працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны прадугледжаны розныя віды і формы вучэбнай работы: лекцыі, семінары, дыскусіі, якія накіраваны на актуалізацыю і паглыбленне тэарэтычных ведаў. Лекцыі забяспечваюць неабходны тэарэтычны ўзровень падрыхтоўкі педагогаў-даследчыкаў. Арганізацыя і методыка правядзення семінарскіх заняткаў пабудавана з улікам рэалізацыі магчымасці фарміравання ў магістрантаў практычных уменняў і навыкаў вырашэння праблем сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Узровень засваення вучэбнай дысцыпліны дыягнастуецца ў працэсе бягучага і выніковага кантролю і завяршаецца выніковай ацэнкай узроўню ведаў і ступені фарміравання ўменняў студэнтаў. Бягучы кантроль засваення тэарэтычных ведаў і практычных уменняў прадугледжаны на семінарскіх занятках і ў працэсе выканання самастойнай работы ў пазааўдыторны час. Выніковы кантроль праводзіцца ў форме экзамену, які выяўляе ўзровень тэарэтычнай і прафесійнай падрыхтоўкі магістрантаў, веданне імі агульных канцэпцый і метадалагічных пытанняў па абранай спецыяльнасці, навуковых і практычных праблем сацыяльна-культурнай дзейнасці. Экзамен таксама выяўляе ступень падрыхтаванасці магістранта да самастойнай навуковай дзейнасці ў абранай галіне.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» ўсяго прадугледжана 188 гадзін, з якіх 76 гадзін – аўдыторныя заняткі (46 г. – лекцыі, 30 г. – семінарскія заняткі). Агульная працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 5 заліковых адзінак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Мэта, задачы і структура вучэбнай дысцыпліны «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці». Роля дадзенай вучэбнай дысцыпліны ў прафесійнай падрыхтоўцы практыкаў і даследчыкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Прадмет сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі.

Вывучэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці як шматбаковай мэтанакіраванай актыўнасці суб’ектаў, сутнасць і змест якой складаюць працэсы засваення, захавання, стварэння, трансляцыі, распаўсюджвання і развіцця культурных каштоўнасцей. Сацыяльна-культурная дзейнасць як базавая катэгорыя, якая ахоплівае розныя сацыякультурныя працэсы і з’явы, а таксама прафесійную сферу спецыялістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел І. Гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці

### *Тэма 1. Сацыяльна-культурная дзейнасць у кантэксце сучасных гістарычных ведаў*

Аб’ект і прадмет гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Распрацоўка праблем перыядызацыі гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як навуковая задача. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Выкарыстанне гістарычнага вопыту асветніцтва, пазашкольнай адукацыі, народнай творчасці, грамадскіх рухаў у арганізацыі сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці. Роля і месца сацыяльна-культурнай дзейнасці ў гісторыка-культурным працэсе.

### *Тэма 2. Вытокі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларусі (IX–XII стст.)*

Культура беларускіх зямель у IX – XII стст. На скрыжаваннях язычніцтва і хрысціянства. Вусная народная творчасць, гераічны былінны эпас. Пеўчыя школы. Распаўсюджванне хрысціянства і

кніжнай культуры. Бібліятэкі на тэрыторыі тагачаснай Беларусі, рэлігійна-асветніцкі характар іх дзейнасці.

Першае ўпамінанне аб скамарохах як першых прафесійных музыках і акцёрах у XII ст. на тэрыторыі Беларусі. Батлейка – старажытны тэатр лялек, асаблівасці рэпертуару і арганізацыі дзейнасці батлеек. Ажыццяўленне тэатральных пастановак.

Абрадавыя традыцыі і формы святочнай дзейнасці. Сацыяльна-культурная накіраванасць дзейнасці вядомых беларускіх асветнікаў Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага.

### *Тэма 3. Развіццё сацыяльна-культурных ініцыятыў у Вялікім Княстве Літоўскім і ў Рэчы Паспалітай*

Развіццё культуры на беларускіх землях у XIII–XVI стст. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці. Рост гарадоў і развіццё гарадской культуры. Храмы і манастыры як цэнтры развіцця беларускай культуры.

Кірмаш як разнавіднасць гуляння і народнага свята. Творчасць скамарохаў у тэатральна-гульнявых дзеяннях. Смаргонская акадэмія скамарохаў і асноўныя кірункі яе дзейнасці. Народныя драмы і тэатральныя ігрышчы.

Саслоўныя формы баўлення вольнага часу (XIII–XVI стст.). Княжацкія маёнткі як першыя цэнтры развіцця музычнай і тэатральнай культуры. Зараджэнне кнігадрукавання ў Беларусі. Асветніцкая і выдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны.

Развіццё культуры на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. Храмы і манастыры як цэнтры культурнага асветніцтва. Сацыяльна-культурнае жыццё беларускіх гарадоў і асаблівасці форм арганізацыі святочна-мастацкай і забаўляльна-відовішчнай дзейнасці. Школьны тэатр у Беларусі.

Асаблівасці сацыяльна-культурнага жыцця магнацка-шляхецкага асяроддзя ў XVIII ст. Прыдворная музычна-тэатральная культура ў часы Рэчы Паспалітай.

### *Тэма 4. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці на беларускіх землях у XVIII – пачатку XX ст.*

Дабрачынныя і добраахвотныя таварыствы, саслоўныя і саслоўна-прафесійныя клубы. Вячоркі ў Беларусі. Народныя гулян-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ні. Беларуская карчма як правобраз вясковага клуба. Кірмашы, святы і абрады ў жыцці беларускай вёскі.

Аматарскія аб’яднанні другой паловы XIX ст. (літаратурныя, музычныя, драматычныя таварыствы). Дзейнасць народных дамоў, народных універсітэтаў, школ выхаднога дня, публічных бібліятэк і інш. Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць «беларускіх хатак». Культура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

*Тэма 5. Сацыяльна-культурная дзейнасць*
*у кантэксце рэвалюцыйных падзей у пачатку XX ст.*

Праграма нацыянальна-культурнага адраджэння. Першыя дэкрэты Савецкай улады аб нацыяналізацыі музеяў, тэатраў, бібліятэк, клубаў, народных дамоў і інш. Арганізацыя культурна-асветніцкай работы. Стварэнне сеткі дзяржаўных культурна-асветных установ. Дзейнасць Наркамата асветы. Палітычнае асветніцтва ў дзейнасці грамадскіх арганізацый (Пралеткульт, прафсаюз, РАПМ, Галоўпалітасвет і інш.).

Палітычная вучоба, барацьба з непісьменнасцю, арганізацыя дзейнасці ў вольны час (мастацкія гурткі, музычныя школы, самадзейныя тэатры). Роля хат-чытальняў у развіцці культурных традыцый беларускай вёскі. Уклад беларускіх навукоўцаў у распрацоўку пытанняў гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў пачатку XX ст.

*Тэма 6. Асноўныя кірункі развіцця*
*культурна-асветніцкай дзейнасці ў БССР*

Культурнае будаўніцтва ў Беларусі (30–40-я гг. XX ст.). Культурна-асветніцкая работа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Развіццё культуры БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Развіццё аматарскай творчасці, дзейнасць народных універсітэтаў, вучэбна-адукацыйных аб’яднанняў.

Асноўныя кірункі развіцця культуры БССР у другой палове 1950 – першай палове 1980-х гг. Сацыяльная роля ўстаноў культуры ў развіцці культурнай сферы вольнага часу, святочнай дзейнасці, арганізацыі адпачынку і аматарскай мастацкай творчасці ў 60–80-я гг. XX ст. Структура дзяржаўнага кіравання культурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніцкай работай у СССР. Падрыхтоўка кадраў культасветработнікаў. Сістэма інфармацыйна-метадычнага кіравання дзейнасцю ўстаноў культуры клубнага тыпу. Агульны стан развіцця сацыяльна-культурнай сферы ў канцы 80 – пачатку 90-х гг.

*Тэма 7. Сацыяльна-культурная дзейнасць у Беларусі ва ўмовах грамадска-палітычных пераўтварэнняў у канцы XX – пачатку XXI ст.*

Педагагічны статус сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасным грамадстве. Асноўныя напрамкі сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, яе асаблівасці, праблемы і перспектывы. Сетка ўстаноў культуры і вольнага часу.

Паняцце «суб’ект сацыяльна-культурнай дзейнасці». Агульная характарыстыка суб’ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларусі. Грамадскія арганізацыі і аб’яднанні як суб’екты сацыяльна-культурнай дзейнасці. Установы культуры як суб’екты сацыяльна-культурнай дзейнасці. Новыя мадэлі ўстаноў культуры ў Беларусі другой паловы XX ст. Функцыі, змест і структура дзейнасці ўстаноў культуры ў розных рэгіёнах краіны (аграгарадок, гарадскі пасёлак, раённы цэнтр, вялікі горад і інш.).

Сацыяльна-культурныя комплексы як сродак комплекснага вырашэння праблем культуры беларускай вёскі. Рэалізацыя пазашкольных форм сацыялізацыі, інкультурацыі і індывідуалізацыі асобы ў дзейнасці сучаснай бібліятэкі. Культурастваральная, выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая функцыі сучаснага музея. Роля музея ў стварэнні культурнага асяроддзя, культурна-адукацыйнай прасторы.

Мэты і задачы дзяржаўнай культурнай палітыкі ў сацыяльна-культурнай сферы ў Беларусі. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы культуры.

## Раздзел II. Тэорыя і метадалогія сацыяльна-культурнай дзейнасці

*Тэма 8. Сутнасць метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метадалогія сацыяльна-культурнай дзейнасці як вучэнне аб метадах, прынцыпах і спосабах навуковага пазнання сацыякультурнай рэчаіснасці. Пабудова і функцыі метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Узроўні метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці: філасофскі, агульнанавуковы, канкрэтна-навуковы, тэхналагічны. Дыялектыка як агульная метадалогія навуковага пазнання.

*Тэма 9. Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукова-адукацыйны кірунак гуманітарных ведаў*

Асноўныя крыніцы фарміравання тэарэтычных ведаў: гістарыяграфія і сучасны стан айчыннай і замежнай сацыякультурнай практыкі, вынікі даследаванняў у сумежных прадметных галінах, педагагічная вопытна-эксперыментальная работа, інавацыйная сацыяльна-культурная дзейнасць і інш.

Сутнасць тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як сістэматызаваных ведаў аб заканамернасцях, прынцыпах, змесце педагагічнага працэсу, тэхналогіях яго ажыццяўлення, метадах, прыёмах і формах яго арганізацыі ва ўстановах сацыякультурнай сферы ва ўмовах вольнага часу.

Структура тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выкарыстанне сучасных дасягненняў педагагічнай думкі ў тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выхаванне як фактар фарміравання і развіцця асобы. Сацыяльна-культурная дзейнасць як аб’ект даследавання.

Аксіялагічная парадыгма сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць і спецыфіка аксіялагічнага аналізу і каштоўнасна-сэнсавага зместу сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Асноўныя катэгорыі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць». Дыялектыка зместу паняццяў «асвета», «пазашкольнае выхаванне», «культурна-асветніцкая работа», «дадатковая адукацыя».

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як вучэбная дысцыпліна і абавязковы кампанент адукацыйнага стандарту падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы.

*Тэма 10. Станаўленне і развіццё*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Змест тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як многааспектнай з’явы, якая аб’ядноўвае сферы культуры, адукацыі, мастацтва, дасугу, народнай творчасці, сацыяльнай рэабілітацыі, турызму. Этапы станаўлення і развіцця тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як аб’екта навуковых даследаванняў.

Навуковыя падыходы да вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Навуковыя школы ў сучаснай тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Асноўныя кірункі вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці расійскімі даследчыкамі: педагагічны (сацыяльна-педагагічныя канцэпцыі), дасугавы (культурна-дасугавыя канцэпцыі), арганізацыйна-тэхналагічны (культуралагічныя канцэпцыі).

Асаблівасці развіцця айчыннай навуковай думкі ў прадметнай вобласці сацыяльна-культурнай дзейнасці. Асноўныя кірункі вывучэння сацыяльна-культурнай дзейнасці беларускімі даследчыкамі: сацыякультурны, сацыяльна-педагагічны, сацыя-медыкапсіхалагічны.

Этапы станаўлення і кірункі даследаванняў у беларускай навукова-педагагічнай школе сацыяльна-культурнай дзейнасці. Праблемы даследавання сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах. Інавацыйны характар і сутнасць навізны сучасных дысертацыйных даследаванняў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 11. Сацыяльна-культурная дзейнасць як від педагагічнай практыкі*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як працэс педагагічна арганізаванага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва мноства суб’ектаў – носьбітаў культуры, мастацтва, адукацыі, дасугу.

Педагагічная дэтэрмінанта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Заканамернасці, прынцыпы, метады і сродкі выхавання ў сучаснай педагагічнай навуцы як тэарэтычная аснова практычнай арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Педагогіка супрацоўніцтва як прынцып арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Віды сацыяльна-культурнай дзейнасці адносна розных крытэрыяў: індывідуальная і калектыўная, прафесійная і аматарская, духоўная і матэрыяльна-пераўтваральная, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазнавальная, каштоўнасна-арыентацыйная, творчая, праектная, камунікатыўная, мастацкая, тэхнічная і інш. у адпаведнасці з інтарэсамі і запатрабаваннямі асобы.

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як працэс стварэння ўмоў для матываванага выбару асобай прадметнай дзейнасці ў залежнасці ад яе інтарэсаў з мэтай садзейнічання самарэалізацыі і самаразвіццю асобы, задавальнення эстэтычных, камунікатыўных, рэкрэацыйных, творчых і іншых запатрабаванняў, камфортнага існавання ў соцыуме.

*Тэма 12. Педагагічная сістэма*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Праблемнае поле сацыяльна-культурнай дзейнасці як галіны педагагічнай навукі. Сутнасць сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі аб засваенні, захаванні, стварэнні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, ідэалаў, абрадаў, звычаяў, характэрных для вызначаных сацыяльных груп і накіраваных на выхаванне, адукацыю і развіццё творчага патэнцыялу асобы.

Педагагічная сістэма сацыяльна-культурнай дзейнасці як устойлівае аб’яднанне элементаў: мэта, змест, працэсы, суб’екты, аб’екты, арганізацыйныя формы, вынікі, кіраванне, тэхналогіі.

Паняцце аб’екта сацыяльна-культурнай дзейнасці як мэтанакіраванага працэсу выхавання і адукацыі чалавека ў інтарэсах яго самога і грамадства ва ўмовах спецыяльна арганізаванай сацыякультурнай прасторы. Прадмет сацыяльна-культурнай дзейнасці як сістэма заканамернасцей, прынцыпаў, метадаў і тэхналогій выхавання і адукацыі дзяцей і дарослых ва ўмовах кіруемага педагагічнага працэсу ў сацыякультурных установах.

Паняцце суб’екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Чалавек як суб’ект гэтай дзейнасці. Сацыяльна-дэмаграфічныя, узроставыя і індывідуальныя параметры ўдзельнікаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Характарыстыка сацыякультурных устаноў як абагульненага суб’екта сацыяльна-культурнай дзейнасці. Творцы і спажыўцы культурных каштоўнасцей як суб’екты сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Мэта і задачы сацыяльна-культурнай дзейнасці як навукі. Сувязь сацыяльна-культурнай дзейнасці з другімі навукамі (сацыяльнымі, псіхалагічнымі, біялагічнымі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 13. Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці як зыходныя, кіруючыя ідэі, нарматыўныя патрабаванні да арганізацыі і ажыццяўлення сацыякультурных працэсаў ва ўстановах сацыякультурнай сферы. Эвалюцыя поглядаў навукоўцаў на прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Пабудова сучаснай парадыгмы сацыяльна-культурнай дзейнасці на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых інтарэсаў; усеагульнай масавай культуратворчасці; самаарганізацыі і самасцвярджэння асобы; гуманізацыі зместу і выхаваўчага патэнцыялу гэтай дзейнасці; падпарадкавання гэтай дзейнасці інтарэсам, запатрабаванням і ўстаноўкам асобы; дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурна-гістарычнага, сацыяльна-педагагічнага і нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і навацый; грамадска-дзяржаўнага сукіравання гэтай дзейнасцю і інш.

Характарыстыка змен у ідэалогіі культурнай дзейнасці, абумоўленасць звяртання сацыякультурных устаноў да запатрабаванняў канкрэтнай асобы, гуманізацыі вытворчых адносін, праяўлення трываласці, павагі да меркаванняў меншасці, умення чуць другіх і быць пачутымі імі.

*Тэма 14. Функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Функцыя як адлюстраванне пэўных кірункаў і бакоў дзейнасці асобных людзей, супольнасці, сацыяльна-культурных інстытутаў, грамадскіх фарміраванняў і рухаў. Функцыя як крытэрый ацэнкі сацыяльна-культурных працэсаў, эфектыўнасці работы сацыяльна-культурных інстытутаў і грамадскіх фарміраванняў, іх сацыяльна-выхаваўчага ўздзеяння на асобу.

Вядучыя функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Накіраванасць функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці на выхаванне, развіццё і самаразвіццё асобы, яе самарэалізацыю.

Характарыстыка асноўных функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці як формы сацыяльнай практыкі, якая забяспечвае рэалізацыю выхаваўчых мэт і задач, механізмаў засваення і стварэння культурных каштоўнасцей: адаптацыйная; развіваючая; адукацыйная; культураарыентацыйная; культуратворчая; рэкрэацыйна-аздараўленчая; камунікатыўная.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арыентацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як працэсу на актыўнае засваенне, распаўсюджванне і стварэнне культурных каштоўнасцей, на фарміраванне культурнага асяроддзя жыццядзейнасці чалавека, распрацоўку механізма сацыялізацыі, інкультурацыі і самарэалізацыі.

*Тэма 15. Інфраструктура сацыякультурнай сферы*

Сутнасць сацыякультурнай сферы як сістэмы разнастайных сацыякультурных інстытутаў, якія каардынуюць дзейнасць чалавека па засваенні, інтэрыярызацыі, захаванні, трансляцыі, развіцці культурных каштоўнасцей і ўздзейнічаюць на выхаванне і фарміраванне асобы. Два ўзроўні разумення сутнасці сацыякультурных інстытутаў: нарматыўны і статутны. Сацыякультурныя інстытуты як носьбіты і праваднікі гуманістычных ідэй, заснавальнікі нацыянальнай культуры, народных традыцый, агульначалавечых каштоўнасцей.

Паняцце інфраструктуры сацыякультурнай сферы як сукупнасці матэрыяльных, арганізацыйных, фінансава-эканамічных, кадравых, інфармацыйна-метадычных і іншых рэсурсаў, якія неабходны для ажыццяўлення сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Характарыстыка ўстаноў сацыякультурнай сферы: мастацтва, культурна-адпачынкавыя, навукова-асветныя, турысцка-экскурсійныя, санаторна-курортныя, спартыўна-аздараўленчыя, відовішчна-камерцыйныя, мастацка-адукацыйныя, культураахоўныя.

*Тэма 16. Культурна-адпачынкавая дзейнасць у сучаснай сацыяльна-культурнай тэорыі*

Спецыфіка культурна-адпачынкавай дзейнасці як прасторы сацыялізацыі і інкультурацыі асобы. Характарыстыка функцый культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Асноўныя прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці: творча-пераўтваральны характар яе ўздзеяння; накіраванасць на развіццё крэатыўнасці яе суб’ектаў; улік узроставых і індывідуальных характарыстык яе суб’ектаў і розных сацыяльных груп; сувязь з жыццём і практыкай яе суб’ектаў; апора на ініцыятыву, інтарэсы і запатрабаванні людзей; індывідуалізацыя зместавых механізмаў уздзеяння; паслядоўнасць арганізацыйных складаючых; сістэмнасць вырашэння культурна-адпачынкавых задач; добраахвотны характар удзелу шырокіх слаёў насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культурна-адпачынкавыя канцэпцыі ў сучаснай сацыяльна-культурнай тэорыі. Характарыстыка дзейнаснай, медыка-біялагічнай, культуралагічнай, сацыяльна-культурнай, экалагічнай, эканамічнай канцэпцый вольнага часу.

Культурна-адпачынкавая дзейнасць у сацыякультурных установах: змест, формы, тэхналогіі.

## Раздзел III. Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці

### *Тэма 17. Сутнасць і спецыфіка тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Агульная характарыстыка асноўных тыпаў тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Тыповыя недахопы выкарыстання тэхналагічнага арсенала ў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як працэсу стварэння ўмоў для матываванага выбару асобай прадметнай вобласці дзейнасці ў залежнасці ад яе інтарэсаў з мэтай садзейнічання самарэалізацыі і самаразвіццю асобы, задавальнення эстэтычных, камунікатыўных, рэкрэацыйных, творчых і іншых запатрабаванняў камфортнага існавання ў соцыуме.

Структура тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці як выхаваўчай сістэмы: сацыяльны заказ, мэта, змест, формы, метады, сродкі, матэрыяльна-тэхнічная база, фінансавае забеспячэнне, аб’ект, суб’ект, дыягностыка.

Тэхналогія сацыяльна-культурнай дзейнасці як сістэма ўзаемадзеяння кампанентаў асобных падсістэм: арганізацыйная (кіраванне, фінансаванне, штатны расклад, службовыя інструкцыі, структура); метадычная (метадычныя рэкамендацыі, сцэнарныя распрацоўкі, апісанне вопыту); псіхалагічная (матывы і запатрабаванні ўдзельніка сацыяльна-культурнай дзейнасці, міжасобасныя адносіны і прафесійнае майстэрства спецыялістаў).

Методыка арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці як сукупнасць правіл, патрабаванняў і прыёмаў арганізацыі дзейнасці людзей ва ўмовах вольнага часу, а таксама псіхолага-педагагічнага ўздзеяння на іх свядомасць, пачуцці і паводзіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 18. Формы, метады і сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Форма сацыяльна-культурнай дзейнасці як арганізаваная структура, педагагічнае дзеянне, мерапрыемства, у якім рэалізуюцца задачы, змест і метады канкрэтнага педагагічнага працэсу ва ўмовах вольнага часу. Форма сацыяльна-культурнай дзейнасці як знешняя старана арганізацыі дзейнасці асобы і сацыяльных груп ва ўмовах вольнага часу.

Класіфікацыя форм сацыяльна-культурнай дзейнасці па розных крытэрыях: колькасны ахоп насельніцтва (масавыя, групавыя, індывідуальныя), спосабы ўздзеяння (тэатралізаваныя, гульнявыя, ілюстраваныя), змест і віды дзейнасці (рэкрэацыйныя, інфармацыйныя, рэабілітацыйныя, мастацка-творчыя, спартыўна-аздараўленчыя і інш.).

Метады сацыяльна-культурнай дзейнасці як спосабы яе арганізацыі ў розных сацыякультурных установах. Класіфікацыя метадаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці па розных крытэрыях. Характарыстыка метадаў фарміравання грамадскай свядомасці. Метады стымулявання сацыяльна-культурнай актыўнасці асобы. Метады арганізацыі творчай дзейнасці асобы і калектыву.

Сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці як крыніцы яе ажыццяўлення. Класіфікацыя сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Характарыстыка сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці: тэхнічных, розных відаў мастацтва і літаратуры, сродкаў масавай інфармацыі, аматарскай творчасці і інш.

*Тэма 19. Інфармацыйна-дыскусійныя тэхналогіі*

Інфармацыйна-дыскусійная дзейнасць як сацыяльна-педагагічны працэс. Узбагачэнне і задавальненне пазнавальных інтарэсаў асобы як галоўнае патрабаванне інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці.

Агульныя метадычныя патрабаванні да падрыхтоўкі і правядзення інфармацыйна-дыскусійных праграм: выбар тэмы і распрацоўка назвы праграмы; падбор матэрыялаў; работа з «экспертамі», улік асаблівасцей аўдыторыі. Структура інфармацыйна-дыскусійных праграм і кампазіцыйныя патрабаванні да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнарыя: мэтавая ўстаноўка і лагічная паслядоўнасць інфармацыйна-мастацкіх блокаў, «увядзенне» ў праграму, галоўная частка, кульмінацыя, завяршэнне праграмы, педагагічны аналіз.

Асноўныя формы інфармацыйна-дыскусійных праграм: ток-шоу, дыспут, дыскусія і інш.

### *Тэма 20. Рэкрэацыйна-забаўляльныя тэхналогіі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-псіхалагічная сутнасць рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці. Рэкрэацыйна-забаўляльная дзейнасць як педагагічная праблема.

Функцыі рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці: кампенсатарная, развіццёвая, забаўляльная, рэабілітацыйная, геданістычная, самарэалізацыйная, рэлаксацыйная.

Педагагічныя задачы рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці: актывізацыя ўдзельнікаў, арганізацыя зносін, складанне псіхалагічных умоў для рэалізацыі асноўных функцый рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці.

Асноўныя формы рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці ва ўстановах культуры: шматпраграмныя вечары адпачынку, дыскатэкі, гасцёўні, вячоркі і інш.

### *Тэма 21. Прафілактыка-карэкцыйная дзейнасць і рэабілітацыйныя тэхналогіі*

Сфера вольнага часу як умова рэалізацыі сацыяльна-ахоўных, прафілактыка-карэкцыйных (адаптацыйных, анімацыйных, рэабілітацыйных) тэхналогій. Характарыстыка аб’ектаў уздзеяння прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці: дзеці-сіраты, людзі з абмежаванымі магчымасцямі, дзеці з дэвіянтнымі паводзінамі, ахвяры надзвычайных сітуацый і інш.

Дзейнасць па арганізацыі вольнага часу як сродак прафілактыкі і карэкцыі негатыўнага эмацыянальнага стану асобы.

Мэты і задачы прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці. Сукупнасць карэкцыйных, прафілактычных, развіваючых, дыдактычных задач у структуры культурна-адпачынкавых праграм.

Рэабілітацыйныя тэхналогіі: бібліятэрапія, арт-тэрапія, музыкатэрапія, гульнятэрапія, казкатэрапія, псіхадрама і інш. Псіхолага-педагагічныя патрабаванні да арганізатара рэабілітацыйнай дзейнасці: добразычлівасць, эмпатыя, педагагічны такт, псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць і інш.

*Тэма 22. Святочна-відовішчныя тэхналогіі*

Святочная культура як неад’емная частка жыцця грамадства. Дэтэрмінаванасць святочнай дзейнасці этнакультурнымі, гістарычнымі, рэлігійнымі, грамадскімі традыцыямі, а таксама сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі.

Сувязь святочных традыцый з прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі, сацыяльнай структурай грамадства, узроўнем развіцця вытворчых сіл. Асноўныя формы святочнай дзейнасці ў Беларусі. Класіфікацыя свят, абрадаў і відовішчаў.

Уклад беларускіх даследчыкаў у распрацоўку тэарэтычных і тэхналагічных пытанняў святочна-відовішчнай дзейнасці.

*Тэма 23. Гульнявыя тэхналогіі*

Сутнасць паняццяў «гульня», «гульнявая дзейнасць». Сутнасць і прырода гульні як каштоўнасці вольнага часу. Функцыі гульні: выхаваўчая, камунікатыўная, геданістычная, кампенсатарная, сацыялізацыі і інш.

Класіфікацыя гульняў на падставе інтэлектуальнай і фізічнай нагрузкі на ўдзельнікаў: інтэлектуальныя, адукацыйныя, гульні драматызацыі, дзейнасна-арыентаваныя, гульні фізічнага развіцця. Сацыякультурная дынаміка гульні ў прасторы вольнага часу: гульнявая форма, гульнявы кампанент, гульнявая праграма.

Гульня ў святочна-абрадавай культуры. Развіццё гульнявой культуры ў Беларусі. Беларускія гульнявыя традыцыі ў сучаснай сацыяльна-культурнай практыцы. Уклад беларускіх навукоўцаў у распрацоўку тэорыі і тэхналогіі гульнявой дзейнасці.

*Тэма 24. Драматургія і рэжысура культурна-адпачынкавых праграм*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сінтэтычная прырода культурна-адпачынкавых праграм. Задума, тэма і ідэя як аснова культурна-адпачынкавай праграмы. Спалучэнне літаратурнай і рэжысёрскай ліній у рабоце над задумай.

Сцэнарый як спосаб фіксацыі драматычнага дзеяння. Характарыстыка паняццяў «сцэнарны план», «літаратурны сцэнарый», «мантажны ліст» у кантэксце асноўных этапаў работы над сцэнарыем. Вызначэнне канструктыўных элементаў як важнейшы этап творчай дзейнасці сцэнарыста. Значэнне паняццяў «архітэктоніка», «кампазіцыя». Асноўныя законы кампазіцыі.

Характарыстыка сродкаў уздзеяння, якія выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы сцэнарыя: жыццёвыя факты і дакументы, жывое слова, літаратура, мастацтва, фальклорныя вобразы.

Суадносіны драматургічнай і рэжысёрскай задумы ў культурна-адпачынкавай праграме. Спецыфічныя асаблівасці і прынцыпы рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Мізансцэна як пластычны малюнак праграмы. Мантажны ліст як рэжысёрская партытура.

Характарыстыка асноўных прыёмаў рэжысуры: сцэнічная рэалізацыя метафары, раскрыццё фабулы, паўторы, выкарыстанне мультымедыйных сродкаў, перанос сцэнічнага дзеяння ў глядзельную залу і інш.

## Раздзел IV. Аматарская творчасць і народная мастацкая культура

### *Тэма 25. Гісторыя і тэндэнцыі развіцця аматарскай творчасці ў Беларусі*

Аматарская творчасць як мэтанакіравана арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных, тэхнічных і тэхналагічных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу. Гісторыя станаўлення і развіцця аматарскай творчасці.

